Карыстаючыся ветлівасцю рэдакцыі "Народнай волі", кажу на яе старонках сардэчнае "Да пабачэння" спадарству, з якім звёў мяне лёс пад час маёй пяцігадовай працы на Беларусі ў якасці карэспандэнткі РАР — Польскага агенцтва прэсы. Па першым часе Беларусь была для мяне амаль невядомай. Зараз, праз пяць гадоў жыцця з вамі, ужо ведаю шмат. Але ўсё яшчэ недастаткова, каб здолець зразумець вас да канца. Хаця я намагалася.

Даруйце, што часам, па праўдзе, злоўжывала крытыкай і не хавала раздражнення з нагоды розных бакоў вашага жыцця. Кажу шчыра — гэта вынікала з таго, што вы не былі мне абыякавымі. Хацелася, каб вашае жыццё выслабанілася ад непатрэбных цяжкасцей і сталася больш поўным і свабодным. Жадала б вам таго самага, чаго жадаю і свайму краю, які я люблю і які мяне таксама часам злосціць. Бо і там не бракуе для гэтага нагодаў.

Маё сардэчнае "Да пабачэння" кажу і тым прадстаўнікам афіцыйных улад, кантакты з якімі былі зычлівымі, а часам нават і сімпатычнымі. "Да пабачэння" кажу ўсім тым мілым людзям, з якімі звяло мяне штодзённае жыццё, — людзям, якіх пазнала ў трамваі, краме, на шпацырах з сабакам, а таксама суседзям. Кажу "Да пабачэння" сябрам, якіх знайшла на Беларусі і якіх не "накапіла" нават у Польшчы.

Але сваю сардэчнасць скіроўваю найперш да тых людзей, якія жадаюць жыць у суверэннай, прававой і дэмакратычнай Беларусі. І не толькі жадаюць, але і многае робяць для таго, каб здзейсніць сваю мару. Бачыла іх столькі разоў на беларускіх вуліцах і ў судовых залах...

Так шмат хацела б вам сказаць! Але, ж як вядома, амаль усё мажліва выказаць толькі ў фарбах. Смутак мае чырвоны колер, энергія — ярка-жоўты. Чалавек бывае светлы альбо шэры. Беларусь мае колер бел-чырвона-белы. Па-сапраўднаму трывалы. Па-сапраўднаму трывалых колераў немагчыма ані знішчыць, ані перамаляваць.

Уршуля МІКАЛАЙЧЫК.

P.S. *Асобна "Да пабачэння" кажу сваім калегам-журналістам, з якімі перажыла столькі агульнага ў цяжкай здабычы інфармацыі. Для некаторых здабываць інфармацыю на Беларусі вельмі проста, але да іх не звяртаюся, бо гэта людзі не маёй прафесіі. Яны прадстаўляюць іншую прафесію і называюцца журналістамі ў выніку нейкага вялікага непаразумення. Гісторыя і гэта, як і ўсё, расставіць на свае месцы.*

І кажу "Да пабачэння" табе, Павел Шарамет! Запрашаю цябе ў Польшчу на маё любімае беларускае шампанскае пад канспіратыўнай назвай "Савецкае". Не маю сумнення, што прымеш запрашэнне і рана ці позна пагасціш у мяне. Пра мяжу не турбуйся. Калі гаворка ідзе пра мяне, то прыму цябе сардэчна, без увагі на тое, перайшоў ты яе легальна ці не. Трымайся! У.М.

Задумаемся

Ад "прымусовай" беларусізацыі да "добраахвотнай" русіфікацыі

Не адзін раз я чуў, як А.Р.Лукашэнка тлумачыў, што па яго прапанове на першым рэферэндуме народ даў права бацькам выбіраць мову навучання сваіх дзяцей, гэта вельмі справядліва і дэмакратычна, і такім чынам ён прыпыніў прымусовую беларусізацыю. Міністр адукацыі В.І.Стражаў на сустрэчы з групай дэлегатаў Другога з'езда беларусаў свету гэту ідэю шырока інтэрпрэтаваў і развіў. Фармальна яны, як быццам, маюць рацыю, але... Але высокія асобы не ўлічылі мэты гэтага працэсу, што з'яўляецца ў дадзеным выпадку галоўным. З прымусовым навучаннем беларусы сутыкаюцца даўно, бо кожная дзяржава праз адукацыю ажыццяўляла свае задачы. Царская Расія праз прымусовую рускую школу праводзіла русіфікацыю насельніцтва Паўночна-Заходняга краю. Тады вучыліся нашы бацькі і дзяды. Я і мае знаёмыя ў Ашмянах да 1939 года ў Заходняй Беларусі займаліся ў польскіх школах, бо дзяржава вяла палітыку паланізацыі жыхароў Усходніх Крэсаў. Калі ў 20-ых гадах у БССР узнялася моцная хваля беларускага адраджэння, то яна была спынена разгромам і знішчэннем нацыянальных дэмакратаў — лепшай часткі нашай інтэлігенцыі. У савецкі час, ужо пасля Вялікай Айчыннай вайны, актыўна дзейнічала тэорыя сцірання граняў, збліжэння і зліцця нацый у адзін савецкі народ па меры набліжэння да камунізму. Таму моцна стымуляваўся пераход на расійскую мову, што паспяхова рабілася ў Беларусі, і ў 80-ых гадах у гарадах амаль што не засталося беларускіх школ, а абсалютная большасць гараджан-беларусаў гаварыла ўжо па-руску.

У пачатку 90-ых гадоў з аб'яўленнем Беларусі незалежнай і суверэннай з'явіўся шанц адрадзіць беларускую нацыю, вярнуць ёй нацыянальныя рысы: мову, культуру, традыцыі, гістарычную памяць. З мэтаю вяртання Беларусі яе сыноў і дачок, страціўшых нацыянальныя пачуцці, большасць гарадскіх школ была пераведзена на беларускую мову навучання ў пэўнай меры сапраўды прымусова. Але ж наша мова тады была адзінаю дзяржаўнаю, і школы на ёй у Рэспубліцы Беларусь былі поўнасцю апраўданы і заканамерныя, а навучанне па-руску не адпавядала прававому статусу дзяржавы. Лічу гэта вялікім дасягненнем работнікаў Міністэрства асветы, раённых аддзелаў і школ 1993—1994 гадоў, бо гэта быў пачатак выпраўлення гістарычных перагібаў у бок русіфікацыі. Такое сталася так патрэбным для адраджэння нацыі, як хвораму хірургічная аперацыя дзеля ўратавання яго жыцця: а тут цэлага народа, беларускага этнаса і дзяржавы, іх будучыні.

Вядома, такое становішча ў адукацыі не адпавядала інтарэсам рускіх, якіх у нас шмат, беларусаў, якія ўжо "пераламаліся" на рускі лад, так званых інтэрнацыяналістаў і інтэгратараў, якія выхаваліся за гады камуністычнай улады, а разам складаюць большасць. Яны не пагаджаліся, пратэставалі. Зноў узнікла магчымасць зрабіць гістарычную папраўку, павярнуць ход падзей назад, што было зроблена з падачы прэзідэнта. У выніку заціснуты інтарэсы карэнных беларусаў, знікла перспектыва адраджэння беларускай мовы. Вось адкуль трывогі і непакой свядомай часткі нашага грамадства, непрыняцце такой палітыкі А.Р.Лукашэнкі апазіцыяй. Тым больш што правільныя словы кіраўніка рэспублікі аб падтрымцы нашай мовы разыходзяцца з іх дзейнасцю, не падмацоўваюцца справамі.

У многіх гарадскіх школах у 1995—1996 гадах ішла і цяпер ідзе сапраўдная барацьба бацькоў з кіраўніцтвам школ і настаўнікамі за права навучаць сваіх дзяцей на роднай мове, бо класы і цэлыя школы хутка пераводзяць на рускую мову навучання. У Гродне з гэтай прычыны ўзнік судовы працэс паміж гр. Ю.Мацко і службовымі асобамі, але закончыўся не на яго карысць. У абарону нацыянальнай школы ў мінулым годзе створана грамадская арганізацыя Таварыства беларускай школы, як некалі ў Заходняй Беларусі пры паляках. Актывісты збіраюць подпісы, пішуць скаргі, петыцыі, праводзяць пікетаванні.

Бясспрэчна, зрусіфікаванае насельніцтва Беларусі не прадстаўляе інтарэсаў усёй нашай нацыі, яму не патрэбна нацыянальнае адраджэнне, яго поўнасцю задавальняе саюз і аб'яднанне з Расіяй. Але такое выражэнне волі народа, як і ініцыятывы А.Лукашэнкі "паправіць гісторыю", носіць антынацыянальны характар. Як бачым, спыненне "прымусовай" беларусізацыі ставіць пад пагрозу існаванне нашай мовы, а таксама будучыню Баларусі і ўсёй нацыі. Узамен атрымалі "добраахвотны" працяг узмоцненай русіфікацыі і ў перспектыве — можа, і недалёкай — зліццё ў адну славянскую дзяржаву і адзіны народ. Сённяшнія частыя заявы кіраўніка дзяржавы аб саюзе суверэнных і незалежных Беларусі і Расіі патрэбны да таго часу, пакуль Рэспубліка Беларусь служыць яму апорай, пляцоўкай для ўзлёту вышэй і далей. У высnове: патрэбна вяртанне да палітыкі падтрымання нацыянальнага адраджэння — беларускай мовы, культуры, гісторыі, "...каб не ўмёрлі!" — як казаў Ф.Багушэвіч яшчэ ў мінулым стагоддзі.

Міхаіл ПУЗІНОЎСКІ,
выдатнік народнай асветы, пенсіянер.

г.Ашмяны.

Спіс унікальных азёр Віцебшчыны папоўніла Бродна

Адразу тры віды раслін, занесеных у Чырвоную кнігу рэспублікі, знайшла на возеры Бродна ў Расонскім раёне навуковая экспедыцыя Віцебскага дзяржаўнага універсітэта на чале з прафесарам Анатолем Дарафеевым. Сярод незвычайна багатага расліннага комплексу вадаёма знойдзены цэлыя зараснікі вельмі рэдкай лабеліі Дортмана, пасяліліся тут гарлачык белы і палушнік азёрны. Першых дзвюх раслін на Віцебшчыне больш нідзе няма, а ў рэспубліцы гэта трэцяе месца, дзе яны растуць.

На думку ўдзельнікаў экспедыцыі, на возера Бродна павінен распаўсюджвацца рэжым ахоўнага аб'екта. Усяго на Віцебшчыне асабліва ахоўныя тэрыторыі складаюць 9 працэнтаў плошчы вобласці, на 360 тысячах гектараў ажыццяўляецца ашчаднае землекарыстанне. Водаахоўныя зоны ўстаноўлены на 965 малых рэках і іншых вадаёмах, агульная працягласць якіх складае 13 тысяч 265 кіламетраў.

Вольга СІДАРОВІЧ, БелТА.

Віцебск.

Экспартны кантроль падмацоўваецца законам

Намаганнямі спецыялістаў Мінзнешэканамсувязей сумесна з прадстаўнікамі Міністэрства замежных спраў, Мінюста, КДБ, Дзяржаўнага мытнага камітэта ў Беларусі распрацаваны праект Закона "Аб экспартным кантролі".

Як паведамілі карэспандэнту БелТА ў Знешнеэканамічным ведамстве, пры яго падрыхтоўцы былі вывучаны і выкарыстаны аналагічныя дакументы Польшчы, Чэхіі, ЗША і Германіі. Акрамя гэтага, канчатковы тэкст праекта прайшоў экспертызу ў амерыканскіх спецыялістаў у Мантэрэйскім інстытуце міжнародных даследаванняў. Напрыклад, амерыканцы ў сваім заключэнні адзначылі, што дакумент адпавядае патрабаванням міжнародных рэжымаў па нераспаўсюджванню і кантролю зброі масавага паражэння, сродкаў яе дастаўкі, узбраення і ваеннай тэхнікі, тавараў двайнога прымянення.

Станоўчыя ацэнкі па тэксту праекта закона таксама далі эксперты Германіі, Міністэрства гандлю ЗША.

БелТА.

"Праект Чарнобыль" завершаны, але дапамога працягваецца

Аб завяршэнні сваёй праграмы "Праект Чарнобыль" аб'явіла італьянская экалагічная арганізацыя "Легамб'ентэ". За гады яе ажыццяўлення больш чым 10 тысяч дзяцей з забруджаных радыяцыяй раёнаў Беларусі, Украіны і Расіі атрымалі магчымасць правесці свае летнія канікулы ў Італіі. Згодна з даследаваннямі італьянскіх спецыялістаў, за месяц знаходжання ў незаражаным асяроддзі з арганізма дзяцей выводзіцца да 50 працэнтаў ізатопаў цэзію-137 і ўмацоўваецца імунная сістэма.

Як паведамляе ІТАР-ТАСС, ажыццяўленне праграмы "Праект Чарнобыль" выклікала ў Італіі ўсплеск салідарнасці з пацярпелымі ад катастрофы. У розных рэгіёнах краіны ўзніклі шматлікія камітэты грамадскай падтрымкі, якія апрача прыёму дзяцей правялі цэлую серыю гуманітарных акцый. І, нягледзячы на завяршэнне праграмы "Праект Чарнобыль", арганізацыя "Легамб'ентэ" мае намер прадоўжыць аказанне дапамогі насельніцтву трох славянскіх дзяржаў, якое пацярпела ад катастрофы. У прыватнасці, наступным летам яна плануе прыняць з чарнобыльскіх раёнаў вялікую групу дзяцей, якія перанеслі хірургічныя аперацыі, і арганізаваць у перыяд іх знаходжання ў Італіі курс аднаўленчай тэрапіі. Акрамя таго, "Легамб'ентэ" мае намер ажыццявіць шэраг паставак гуманітарных грузаў з медыкаментамі для сельскіх бальніц.

Беларускі праект падтрымалі ў Крыме

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь ва Украіне Віталь Курашык правёў перагаворы са старшынёй Савета міністраў Крымскай Аўтаномнай Рэспублікі Анатолем Франчуком і яго намеснікам Аляксандрам Баталіным аб стварэнні ў Сімферопалі сумеснай вытворчасці кормаўборачных камбайнаў. У прыватнасці, беларускі бок прапанаваў стварыць СВ на базе мясцовага завода сельскагаспадарчага машынабудавання пры ўдзеле "Гомсельмаша".

Як паведаміў карэспандэнту БелТА саветнік беларускага пасольства Уладзімір Бокач, кіраўнікі Крыма выказалі гатоўнасць ажыццявіць гэты праект, які дасць магчымасць выкарыстоўваць магутнасці сімферопальскага прадпрыемства, стварыць новыя рабочыя месцы, забяспечыць паўвостраў і сумежныя вобласці Украіны сельскагаспадарчай тэхнікай. У бліжэйшы час прадстаўнікі "Гомсельмаша" выедуць у Сімферопаль для арганізацыі сумеснай вытворчасці.

У ходзе гутаркі беларускага дыпламата з кіраўніцтвам Крыма былі абмеркаваны таксама пытанні аздараўлення ў гэтым рэгіёне дзяцей з чарнобыльскай зоны Беларусі.

БелТА.

Гарадзенская "Школа маладога журналіста"

10 кастрычніка ў памяшканні Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі ў Гродне (вул. Замкавая, 16) адбудзецца прэзентацыя "Школы маладога журналіста".

Праект школы маладых творцаў быў распачаты ў сакавіку бягучага года. Курс тэарэтычных і практычных заняткаў, якія доўжыліся амаль на працягу чатырох месяцаў, прайшлі ўсяго дваццаць чалавек. Прычым практычна ўсе яны друкаваліся ў мясцовых і цэнтральных выданнях. Між іншым, падчас прэзентацыі першыя выпускнікі гарадзенскай "Школы маладога журналіста" атрымаюць пасведчанні.

Дарэчы, праект "Школы маладога журналіста" сумесна ажыццяўляюць Гарадзенскі рэгіянальны цэнтр інфармацыйнай падтрымкі грамадскіх ініцыятыў "Трэці сектар", "Моладзевы прэс-клуб" і культурна-асветніцкі фонд "Бацькаўшчына".

Трэба адзначыць, што новая праграма "Школы маладога журналіста" прадугледжвае васьмімесячны курс тэарэтычных заняткаў, практычных трэнінгаў і стажыровак у мясцовых і, па магчымасці, замежных выданнях. Заняткі ў школе праводзяць лепшыя журналісты гарадзенскіх і цэнтральных рэспубліканскіх выданняў.

Вітаўт РУДНІК.

Новы беларускі тралейбус атрымаў права на жыццё

Новая мадэль тралейбуса "АКСМ-201" вытворчага аб'яднання "Белкамунмаш" прайшла сертыфікацыю ў адпаведных органах. Ацэнка выносілася па 14 асноўных тэхнічных патрабаваннях, што прад'яўляюцца да рухомага саставу гэтага класа. Такім чынам, беларускі тралейбус другога пакалення набыў, як кажуць, поўнае права на вялікае жыццё. Праўда, у адпаведнасці з існуючымі нормамі, яму яшчэ трэба атрымаць аналагічнае пацвярджэнне сваіх тэхнічных якасцей ад спецыялістаў Расійскай Федэрацыі.

Як паведамілі карэспандэнту БелТА ў "Белкамунмашы", у гэтым годзе выпушчаны 21 тралейбус мадэлі "АКСМ-201". Машыны працуюць ва ўсіх гарадах рэспублікі, дзе выкарыстоўваецца электратранспарт, а таксама ў шэрагу гарадоў Расіі. Паводле слоў спецыялістаў, яны выдатна зарэкамендавалі сябе пры эксплуатацыі.

Таццяна СМІРНОВА.

Служба "01" інфармуе

За першыя пяць дзён кастрычніка ў рэспубліцы зарэгістравана 137 пажараў, у выніку якіх загінулі 8 чалавек.

Паводле інфармацыі, атрыманай БелТА ў Галоўным упраўленні ваенізаванай пажарнай службы, агнём знішчана і пашкоджана 73 пабудовы, 5 адзінак тэхнікі, 101 тона грубых кармоў, 6 галоў жывёлы.

Агульны матэрыяльны ўрон склаў 897 мільёнаў рублёў.

Пажарныя падраздзяленні ўдзельнічалі ў ліквідацыі 137 аварый. Выратавана матэрыяльных каштоўнасцей на суму 2 мільярды 237 мільёнаў рублёў.

Яшчэ адзін "Залаты Меркурый" дастаўся беларускаму прадпрыемству

Вытворчае аб'яднанне "Белкамунмаш" залічана ў склад удзельнікаў еўрапейскай праграмы "Партнёрства дзеля прагрэсу". Гэта праграма, нагадаем, створана пры ўдзеле шэрага буйнейшых міжнародных фінансавых і інвестыцыйных кампаній, банкаў, агенцтваў, прамысловых прадпрыемстваў і грамадскіх арганізацый. Што датычыць праяўленай увагі да беларускага аб'яднання, якое спецыялізуецца на выпуску тралейбусаў, то яно звязана перш за ўсё з прысуджэннем яму каардынацыйным цэнтрам гэтага грамадскага фарміравання ганаровага прыза "Залаты Меркурый". І ўдастоены "Белкамунмаш" такой высокай ацэнкі за дынаміку і эфектыўнасць вытворчасці, шырокі асартымент выпускаемай прадукцыі, вялікі ўклад у вырашэнне экалагічных праблем.

Таццяна СМІРНОВА, БелТА.

Беларусь — Германія

У Шлезвігу ходзяць чуткі...

Гэтымі днямі ў Мінск завітаў **віцэ-прэзідэнт таварыства "Захад — Усход" нямецкай зямлі Шлезвіг — Гальштэйн Ганс-Фрыдрых Мюлер.** Наш карэспандэнт сустрэўся з ім і пацікавіўся мэтай яго чарговага візіту.

— Наша таварыства жадае ўмацоўваць супрацоўніцтва з беларускімі партнёрамі. У асобе Беларускага таварыства дружбы мы займелі надзейнага паплечніка, — пачаў Ганс-Фрыдрых Мюлер. — Сумесна правялі Дні Беларусі на нашай зямлі і Дні Германіі ў Мінску. Яны пакінулі добры след.

— Дык, мабыць, збіраецеся працягваць такую практыку?

— Ну так. Але канкрэтна гаварыць аб чарговых Днях пакуль рана.

— Чаму?

— Правядзенне такой акцыі патрабуе нямала сродкаў. А ў сённяшніх умовах разлічваць на падтрымку нашых нямецкіх улад не прыходзіцца.

— Гэта тлумачыцца пахаладаннем у адносінах паміж нашымі краінамі?

— Так. Яно відавочнае.

— Як цяпер бачыцца Беларусь з Германіі?

— Вядучыя, уплывовыя газеты, тэлебачанне гавораць аб усталяванні ў вас дыктатарскага рэжыму. Некаторыя нашы грамадзяне цяпер не хочуць наведваць Беларусь.

— Словам, вымалёўваецца даволі непрывабны вобраз нашай краіны?

— Хутчэй адмоўны. А тут і з візай новыя праблемы.

— Якія?

— Раней, калі я ехаў да вас, за візу наогул не плаціў. На гэты раз выклаў сто марак. За ёю трэба ехаць у Бон. Не ўсе захочуць губляць шмат часу.

— Усё гэта, відаць, адмоўна паўплывае і на гуманітарныя праграмы?

— У Германіі шмат арганізацый і людзей, якія гатовы дапамагаць тым, хто пацярпеў ад Чарнобыля. Але яны хочуць, каб іх дапамога трапляла тым, каму яны яе накіроўваюць, як кажуць — "з рук у рукі", а не ляжала тыднямі на складах і невядома кім размяркоўвалася б. У нас ходзяць чуткі, што гуманітарная дапамога нярэдка распрадаецца. Вядома, гэта не спрыяе справе.

— З нашай гутаркі вынікаюць невясёлыя вывады. Па якіх жа накірунках вы збіраецеся развіваць супрацоўніцтва?

— Я прыехаў, каб вывучыць магчымасці паглыблення супрацоўніцтва. Вядома, будзе аказвацца гуманітарная дапамога лекамі тым, хто мае патрэбу. Штогод на нашай зямлі адпачывае 1.300 беларускіх дзяцей. Мяркуем наладзіць стажыроўку вашых настаўнікаў нямецкай мовы.

Мы павінны працягваць кантакты, супрацоўніцтва ў тых галінах, дзе ёсць магчымасць. Вось тут і адказ на ваша першае пытанне. Мэта майго візіту — абмеркаваць праблемы, якія ўзніклі, і параіцца з беларускімі партнёрамі наконт канкрэтных праектаў.

Алесь ДРАБЧУК.

Сверим часы?

"Европейское" время... французской книги в Беларуси. Третий год кряду

В этом году в очередной раз будет проводиться национальная французская акция "Время книг", организованная министерством культуры Франции, которая пройдет с 10 по 20 октября 1997 года по всей Франции и за ее рубежами. Третий год подряд "Время книг" будет праздноваться в Минске.

В этой культурной акции традиционно участвуют библиотеки, книжные магазины, издательства, литературные музеи, учебные заведения, средства массовой информации.

Повсюду организуются выставки, встречи, чтения, разного рода мероприятия, задача которых состоит в привлечении новых читателей, знакомстве с существующими фондами, встречах с различными деятелями мира книги и письменного слова. Таким образом, в этом году, к примеру, во Франции будут проведены "Выходные дни в книжной лавке" и "Дни библиотекарей", специальные мероприятия в школьных библиотеках.

Тогда, в 1995 году, впервые проведенный большой конкурс для изучающих французский язык дал возможность юным минчанам, говорящим по-французски, проследить путь книги в книжных магазинах и библиотеках столицы. Конкурс завершился в лингвистическом университете большим праздником чтения. В 1996 году только что созданный франко-белорусский зал информации о современной Франции открыл свои двери в Областной библиотеке им.А.С.Пушкина, а музей Янки Купалы отметил праздник перевода.

В дни нынешней акции (заметим, все мероприятия бесплатные и открыты для широкой публики) мы предлагаем нашим белорусским партнерам (библиотекам, школам и университетам, издательствам, средствам массовой информации) обратить особое внимание на современную литературу.

В течение двух недель около десятка мероприятий (выставки, презентации, конкурсы, мастерские, трибуны, показы и т.д.) позволят всем читателям открыть современную французскую литературу на французском языке или в переводе, приобщиться к литературному переводу, обменяться мнениями по поводу детективных романов, которые в этом году стоят в центре внимания: им посвящен организованный для школьников конкурс. У истинных знатоков французского и Франции есть настоящий шанс выиграть бесценный подарок: современные и, главное, многочисленные французские книги.

Для получения дополнительной информации можно обращаться:

Минск, ул.Гикало, 4, Областная библиотека им.А.С.Пушкина, франко-белорусский зал информации о современной Франции. Тел./факс 239-69-24. Коринн Жоливе и Марина Завадская;

Минск, пл.Свободы, 11, отдел культуры посольства Франции. Тел. 210-28-68, факс 210-25-51.

Людмила СИЛЬНОВА.

Безобидный жест в Бангладеш вызвал драку

Людас ДАПКУС

Более половины информации собеседники передают друг другу без слов.

О том, что скрещенные на груди руки означают попытку собеседника защититься, а прикрытый ладонью рот лжет, знают все, кто более-менее интересуется символикой языка тела. Но существует еще и язык жестов, который мотивирует не реакция подсознания на ситуацию, а культурные традиции.

Во многих странах одинаковы жесты, означающие удовлетворение или согласие. Но кое-где, применив их, вы рискуете быть непонятым или, того хуже, можете даже кого-нибудь оскорбить.

В Литве, как и во многих странах Европы и Америки, поднятый вверх большой палец означает "все в порядке" или "мне это нравится". Но когда министр судоходства из Бангладеш в прошлом году поднял большой палец перед депутатом оппозиции, в парламенте случилась драка. В этой стране, как и в Иране, Гане и Нигерии, этот жест означает "пинок тебе под зад!".

Поклонники рок-металла искренне верят, что поднятый вверх указательный палец и мизинец — уникальный жест, символизующий музыку данного направления. Я не знаю, какой жест популярен у металлистов Италии, потому что в этой стране указательный палец и мизинец со средневековья называют знаком "корна". И если вы покажете его уважающему себя итальянцу, а тем более сицилийцу, у вас могут быть большие неприятности. В Италии два поднятых вверх пальца означают голову быка, то есть рога. А это понятие известно даже в Литве и означает, что муж для своей жены — уже не единственный.

Пожалуй, самый универсальный жест — открытая ладонь. Почти на всей планете он означает мирные намерения, безоружность. Но только не в Греции, где такой жест будет значить "мордой — в дерьмо".

Причины появления этого жеста следует искать в византийских традициях. Именно в те времена в Греции стали применять новую методику перевоспитания арестантов. Их привязывали к столбам на улицах, и любой прохожий мог навозом вымазать преступнику лицо.

Знак "о'кей" — соединенные в кольцо большой и указательный пальцы — на Ближнем Востоке и в некоторых странах Южной Америки — оскорбление. Этот жест воспринимается как визуальная метафора заднего проходного отверстия.

Излюбленный жест политических лидеров — размахивание кулаком на уровне груди — в Великобритании символизирует онанирование.

Во всех странах ковыряние в носу в большей или меньшей степени считается некультурным. Но в Ливии и Сирии таким жестом можно продемонстрировать презрение к оппоненту.

Во время своего пребывания в Ливане я не раз убеждался, что дислоцированных там сирийских солдат не любят именно из-за этой странной привычки. Сирийские солдаты завершают иногда спор, бросая в оппонента то, что выковыривают из носа, выражая тем самым свое презрение.


Поднятый вверх большой палец президента США Б.Клинтона в Бангладеш означал бы "пинок тебе под зад!"


Жест лидера Палестины Я.Арафата в Италии был бы понят однозначно: "Мужик, ты рогоносец!"


Лидер России Б.Ельцин демонстрирует добрые намерения, но для греков этот жест означал бы "мордой тебя — в дерьмо".


На снимке, сделанном папарацци, — королева Великобритании Елизавета II. В Сирии этот жест означает "конец спора".

Литва

Первые претенденты на пост президента Литвы

В Литве официально началась предвыборная кампания по выборам главы государства, намеченным на 21 декабря.

Как сообщила "Интерфаксу" член Главной избирательной комиссии (ГИК) Живиле Вербилайте, начался прием документов от лиц, желающих баллотироваться кандидатами на пост главы государства.

По ее мнению, кампания, по-видимому, будет активной. Свой прогноз Ж.Вербилайте аргументировала тем, что в первый день приема документов желающих баллотироваться на пост президента заявления в ГИК на регистрацию намерены внести 5 претендентов.

По избирательному закону, по истечении 3 дней после внесения документов ГИК должна изучить полученные документы и, если нет оснований для отказа, выдать бланки для сбора подписей. Претенденты должны внести в ГИК залог в сумме 4 тыс. литов (около 1 тыс. долл.) и до 6 ноября собрать 20 тыс. подписей в свою поддержку. 16 ноября регистрация кандидатов завершается, 21 ноября начинается предвыборная агитация.

О намерении баллотироваться на пост главы государства уже заявили председатель сейма **Витаутас Ландсбергис,** проживающий в США эколог литовского происхождения **Валдас Адамкус,** бывший заместитель Генерального прокурора **Артурас Паулаускас**, член сейма **Казис Бобялис**, лидер Национал-демократического движения, выступающего против интеграции Литвы в Европейский Союз, член сейма **Римантас Сметона**, радиожурналист **Вайдотас Жукас** и профессор-антрополог **Люция Башкаускайте**.

Нынешний президент Альгирдас Бразаускас свое решение относительно участия в выборах объявил отдельно в выступлении по телевидению.

Как сообщила Ж.Вербилайте, первым документы в ГИК внес 53-летний Р.Сметона, который, по итогам последних социологических опросов, по популярности среди потенциальных кандидатов находится на пятом месте. Сам Р.Сметона уверен, что его шансы на победу высоки, и помочь ему в этом может известная фамилия: Р.Сметона является внуком брата бывшего президента Антанаса Сметоны, возглавлявшего Литовское государство в 1919—1920 и 1926—1940 гг.

Ландсбергиса по-прежнему обвиняют в... связях с КГБ

Сообщения о том, что специальная парламентская комиссия получила свидетельства, подтверждающие якобы имевшее место сотрудничество В.Ландсбергиса с КГБ, вызвали резонанс в прессе, политических кругах и у общественности страны.

Глава правительства Гедиминас Вагнорюс осудил получившие огласку обвинения в адрес председателя сейма в возможных связях с КГБ, назвав их "грубым выпадом". "Против лидера восстановления независимости в личных и политических целях инспирируется грубый выпад, опирающийся на обвинения офицеров враждебной советской безопасности", — говорится в заявлении премьер-министра, распространенном в четверг в Вильнюсе.

Г.Вагнорюс является председателем правления партии консерваторов, возглавляемой председателем парламента. По мнению премьера, подозрения, высказанные в адрес главы сейма, "не только оскорбляют чувства тысяч людей, но и провоцируют вражду в обществе".

Показания бывших сотрудников КГБ, подтверждающие якобы имевшее место сотрудничество В.Ландсбергиса с этой организацией, были переданы парламентской комиссии. По словам свидетелей, В.Ландсбергис сотрудничал с КГБ, имел кличку, встречался с сотрудниками КГБ на конспиративных квартирах, предоставлял информацию "об идеологически вредных" поступках одноклассников, сотрудников, поэтов.

Ранее В.Ландсбергиса в сотрудничестве с КГБ обвинил член сейма, экс-министр охраны края Аудрюс Буткявичюс.

Парламентская оппозиция предложила В.Ландсбергису временно прекратить свою политическую деятельность. "В.Ландсбергису лучше не отождествлять себя с государством, временно приостановить политическую деятельность и позволить провести расследование по фактам", — заявил на пресс-конференции представитель оппозиционной Демпартии труда Литвы (ДПТЛ) Повилас Гилис. По его словам, если факты не подтвердятся, В.Ландсбергис сможет править дальше "с поднятой головой".

П.Гилис подчеркнул, что ДПТЛ не имеет никакого отношения к этой истории, хотя уже давно располагает некоторой информацией о возможном сотрудничестве В.Ландсбергиса с КГБ. При этом представитель ДПТЛ отметил, что эта информация "не была достаточно аргументирована, но теперь, когда появились свидетели, на это нельзя махнуть рукой". Он подчеркнул, что, если будут выявлены связи спикера с КГБ, придется заново пересмотреть историю Литвы последних лет. Расследование "дела Ландсбергиса" — в интересах всего государства, поскольку он — второй после президента человек в стране.

В политических кругах Литвы высказывается мнение: муссирование темы якобы имевшего место сотрудничества В.Ландсбергиса с КГБ может быть связано с начавшейся кампанией по выборам президента. Нынешний спикер парламента считается одним из основных претендентов на пост главы Литвы.

Молдова

Лучинский подтверждает стремление Кишинева предоставить Приднестровью специальный статус с широкой автономией

Президент Петр Лучинский выразил уверенность, что "в нынешнем месяце удастся подписать документ о разграничении полномочий с Приднестровьем и установлении совместных прерогатив". Об этом он заявил на встрече с делегацией ОБСЕ во главе с послом Дании при ОБСЕ Карстеном Петерсеном. По мнению президента, этот документ будет способствовать процессу окончательного решения приднестровской проблемы.

Говоря о ходе переговорного процесса, П.Лучинский подтвердил стремление руководства страны решить проблему путем предоставления Приднестровью специального статуса с широкой автономией, на основе соблюдения территориальной целостности Молдовы.

Украина

Предстоящая неформальная встреча Кучма — Ельцин — в завершающей стадии подготовки

В настоящее время по дипломатическим каналам обсуждаются время и "технические детали" предстоящей вскоре встречи президентов Украины — Леонида Кучмы и России — Бориса Ельцина. Об этом сообщил корреспонденту "Интерфакса" заместитель руководителя пресс-службы президента Украины Сергей Куцый.

Он напомнил, что президенты обеих стран ранее достигли договоренности о подобной неофициальной встрече.

Секретарь СНБО считает "неудовлетворительным" сотрудничество Украины с НАТО

Секретарь Совета национальной безопасности и обороны Украины (СНБО) Владимир Горбулин считает неудовлетворительным положение дел с практической реализацией программы сотрудничества, "особенно в военной сфере", между Украиной и НАТО. Такую оценку он дал в Киеве на первом заседании Государственной межведомственной комиссии по вопросам сотрудничества Украины с НАТО.

По мнению В.Горбулина, сложившаяся ситуация "противоречит курсу на создание условий по особому партнерству Украины и НАТО". За последнее время, подчеркнул секретарь СНБО, в налаживании сотрудничества Украины с альянсом "существенных сдвигов не произошло". Такому сотрудничеству "до сих пор не хватает целенаправленности, последовательности и организованности", полагает он, добавив, что "прежде всего, это касается министерства обороны и Генштаба".

В.Горбулин высказался также в пользу разработки фундаментальной государственной программы сотрудничества Украины с альянсом на 1998—1999 годы.

По материалам "Интерфакса"

Беларускі народны соннік

(Працяг. Пачатак у №№111, 114, 119, 126, 148, 153, 158, 168, 173.)

Адзенне, абутак, аздабленні

Адзежу бачыць чорную — пасцель будзець, захварэеш. Таксама: падарунак. **Белую** — дак ета харашо; **новую** — нядуга; асабліва калі хто ў адлучцы ёсь, дак хварэець. Таксама: дабрабыт. У старой адзежы відзець (каго-небудзь), дак, знатца, вясёл ён, здароў. Таксама: на нястачу. **Багатую адзежу** харашэ бачыць. **Многа адзёжы відзець** — клопатаў многа будзя.
Романов. Опыт, с. 65—66.

Адзежу белую бачыць — добра, хвалюць цябе суседзі; **чорную** — нягодна, людзі чэрнюць.
Ляцкий. Материалы, с. 147.

Калі прысніцца чорнае адзенне ці такая ж хустка, гэта значыць, што ў хуткім часе хтосьці абгаворыць, ачэрніць.
Fed., s. 214.

Убранне (адзежа) белае — пабедзіць які чалавек, або вы пабедзіце якога чалавека. **Убранне чорнае** — чарната будзе чалавеку, няшчасце.
Moszynski, s. 152.

Пафарбаваць адзежу (вопратку) цёмнаю хварбай — смутак, **светлаю або чырвонаю** — вясёласць.
Васілеўскі, с. 10.

Аксаміт чорны бачыць — смутак, жалоба.
Васілеўскі, с. 9.

Андарак апрануць — чакай госця, **мыць яго** — цябе кінулі абмаўляць.
Васілеўскі, с. 10.

Армяк — гатоўся ў падарожжа.
Васілеўскі, с. 10.

Аўчынку добрую трымаць у руках — прыемнасць, радасць, удача; **аблезлую** — стратнасць.
Васілеўскі, с. 10.

Балахон — падарожжа.
Васілеўскі, с. 11.

Бісер бачыць — гэта слёзы. Таксама: вялікія клопаты, а малая карысць.
Романов. Опыт, с. 65.

Бот падраны — убытак.
Шейн, III, с. 340.

Боты новыя — прыемнае падарожжа, **парваныя** — прыкрае.
Васілеўскі, с. 11.

Боты шмараваць тлустасцяй — перамена пагоды на макрату.
Васілеўскі, с. 35.

Бурнос апранаць — дарога.
Васілеўскі, с.11.

Бусы, каралі, занізкі — слёзы, і чым буйней, тым горш. Таксама: руку парэжаш.
Романов. Опыт, с. 65.

Каралі чырвоныя — радасць, **белыя** — задавальненне, **чорныя** — смутак.
Васілеўскі, с. 21.

Бурку адзяваць — дажджы пойдуць. Тое ж: дарога чакае. Тое ж: скаціна захварэе. **Здымаць бурку** — засуха, голад. Тое ж: скаціна падохне.
Ляцкий. Материалы, с. 146.

Бялізну чыстую насіць — дык добра, вясёлы будзеш. Таксама: чыстым будзеш. **А брудную** — сорам. Мыць бялізну — плёткі.
Романов. Опыт, с. 65.

Бялізну чыстую насіць — добра, ураджай, удача; **брудную** — нягодна ў дзела пападзеш. **Надзяваць бялізну** — справа важная чакаецца. Тое ж: на хваробу.
Ляцкий. Материалы, с. 146.

Вопратку латаную чорную бачыць — непамыснасць, надзець яе — хвароба.
Васілеўскі, с. 12.

Гальштук на шыю завязваць чорнага калёру — смутак, непамыснасць; **светлага калёру** — будзеш рад у гасцёх.
Васілеўскі, с. 14.

Грэбень цэлы, новы — удачлівае выпаўненне плану, **грэбень без зубоў (шчарбаты)** — шмат прыкрасцяў і недастаткаў пры выкананні задуманага.
Васілеўскі, с. 14.

Грабянец у сне разламаецца, і яго няможна скласці — значыць разыйдзешся з блізкім чалавекам (Шумілінскі р-н).
АІМЭФ, ф. 8, воп. 89. спр., сш. 1, №61.

Жуковіну (пярсцёнак) бачыць — згубіць дружбу, **жуковіну зламаць** — хтось блізкі памрэ, **жуковіну згубіць** — вялікае няшчасце. Гл.: пярсцёнак.
Серж., с. 40.

Жэмчуг — слёзы. Таксама: добрае знаёмства.
Романов. Опыт, с. 65.

Кажух адзяваць — ваўкі авечак зарэжуць.
Ляцкий. Материалы, с. 147.

"Як мужык мой быў у маскалёх, то, бало (бывала), прысніцца мне кажух белы, то без перамены ён да мяне картачку прышле".
Fed., s. 213.

Каменні дарагія мець — багацтва, спадак, выйгрыш.
Васілеўскі, с. 15.

Карону на сваёй галаве мець — павышэнне, паважанне ад іншых, адзнака, пашана.
Васілеўскі, с. 21.

Каўнярок цесны надзець — клопаты, нездавальненне.
Васілеўскі, с. 21.

Кашулю паркалёвую новую ці сукенку апрануць — прыемная навіна.
Васілеўскі, с. 26.

Лапці бачыць — гл.: чаравікі. Тое ж: на смерць.
Ляцкий. Материалы, с. 147.

Лапці плясці — працай палепшыш жыццё.
Васілеўскі, с. 26.

Лапці замест ботаў мець на нагах — абядненне праз кражу.
Васілеўскі, с. 22.

Матэрыял купляць светлы — добра, светлая дарога (Смаргонскі р-н).
АІМЭФ, ф. 8, воп. 90, спр. 248.

Наметка — дарога.
Moszynski, s. 151.

Ніткі зблытаныя бачыць — перашкода ў справах. Гл.: матаць.
Романов. Опыт, с. 65.

Ніткі зблытаныя бачыць — плёткі; **разбіраць ніткі** — на цябе людзі плятуць (гл.: ткаць).
Ляцкий. Материалы, с. 147.

Ніткі ўва сне — нехта абгаворыць.
Pietkiewicz, s. 83.

Ніткі — пачуць плёткі.
Шейн, III, с. 339.

Нітка белая — блізкае, вясёлае падарожжа; **чорная** — блізкае, смутнае падарожжа.
Васілеўскі, с. 25.

Палатно, халсціну бачыць — дарога будзя. **Ручнікі** — на дарогу. **Палатно рассцілаць** — дарога якая-небудзь выпадзе табе. Таксама: пісьмо прыйдзе.
Романов. Опыт, с. 66.
Вар.: *Pietkiewicz*, s. 83; *Moszynski*, s. 151.

Палатно бачыць — у дарогу збірайся. **Ручнік** — дарога, пісьмо. **Фарбаванае палатно** — нягодна: хвароба можа прычыніцца; пажар.
Ляцкий. Материалы, с. 147.

Звой палатна — варожыць дарогу на калёсах або пешкі.
Pietkiewicz, s. 83.

Палатно — дарога; толькі будзе клопатна ў дарозе.
Moszynski, s. 152.
Гл.: ручнік.

Панчохі вязаць — грошы атрымліваць.
Романов. Опыт, с. 66.

Паркаль мераць ці бачыць — грошы атрымліваць.
Романов. Опыт, с. 66.

Новыя пасталы — добра, **а стоптаныя** — пагана.
Pietkiewicz, s. 83.

Пояс завязваць — цяжкая праца, **а развязваць** — палягчэнне працы.
Романов. Опыт, с. 66.

Пояс завязваць — жывот будзе балець; **развязваць** — палягчэнне, папраўка. Тое ж: сям'і прыбавіцца.
Ляцкий. Материалы, с. 147,

Пяро птушынае пры шапцы — сон няважны.
Васілеўскі, с. 26.

Пярсцёнак надзяваць — жаніцца ці выходзіць замуж; **бачыць** — быць на чыім-небудзь вяселлі.
Ляцкий. Материалы, с. 146.
Вар.: *Романов.* Опыт, с. 65.

Рукавіцы надзяваць — перашкода.
Романов. Опыт, с. 66.

Рукаў кашулі адарваны — хваравітасць, страта; **рукаў пальта** — таксама ўбытак паважнейшы.
Васілеўскі, с. 27.

Ручнік белы — доўгае падарожжа, **цёмна-брудны** — няўдалае падарожжа.
Весялоўскі, с. 27.

Стужкі бачыць — замуж пойдзець, калі дзеўка. Таксама: дарога.
Романов. Опыт, с. 65.

Стужкі бачыць — праводзіць у далёкую дарогу каго-небудзь; **упрыгожваць сябе лентамі** — самому некуды прыдзецца ехаць.
Ляцкий. Материалы, с. 147.

Сукенку бачыць — атрымаеш пісьмо (Смаргонскі р-н).
АІМЭФ, ф. 8, воп. 90, спр. 248.

Халявы шырокія ў сваіх ботах — багацце.
Васілеўскі, с. 31.

Хустку бачыць — пісьмо будзе. Таксама: падарунак.
Романов. Опыт, с. 66.

Хустку бачыць — пісьмо прыйдзе. **Хустку рассцілаць** — пісьмо пісаць. **Чорная хустка** — благія весткі.
Ляцкий. Материалы, с. 147.

Калі прысніцца чорная хустка або якаясь чорная адзежына — будзе пячаль.
Pietkiewicz, s. 82.

Хустка чорная — жалоба; **белую надзець хустку** — дзяўчыне к сустрэчы з хлопцам; **чырвоная хустка** — знаёмства, **жоўтая** — к разлуцы. (Смаргонскі р-н).
АІМЭФ, ф. 8, воп. 90, спр. 248.

Хусткай цёплай абкрывацца — перамена к лепшаму, дастатак; **хустку парваную абглядаць** — прыкрыя плёткі, недастатак.
Васілеўскі, с. 32.

Цыліндар на галаве мець — пашана, высокі чын.
Васілеўскі, с. 33.

Чапец бачыць — раіцца з кім-небудзь пра важныя справы; **надзець** — клопаты.
Ляцкий. Материалы, с. 147.
Вар.: *Романов.* Опыт, с. 66.

Чапец чорны на галаве — смутак.
Васілеўскі, с. 34.

Чаравікі калі абуеш — добра, **а разуешся** — дрэнна. **Новыя чаравікі** — радасць, **старыя** — непрыемнасць. Таксама: патрэба. **Галоўкі ад старых сапагоў бачыць** — значыць зробіш што-небудзь такое, што пасля сябе дурнем назавеш.
Романов. Опыт, с. 65.

Чаравікі абуваць — да багацця; **разуваць** — да беднасці. Тое ж: да хваробы.
Ляцкий. Материалы, с. 146.

Чаравікі надзець старыя — пойдзеш у знаёмую дарогу, **новыя чаравікі** — незнаёмае падарожжа.
Васілеўскі, с. 34.

Шапку надзяваць — клопаты. **Шапку добрую насіць у сне** — гонар, **а дзіравую** — сорам.
Романов. Опыт, с. 66.

Шапку купляць — нажываць клопаты. Гонар і слава.
Ляцкий. Материалы, с. 147.

Шапка на галаве — блізкае падарожжа.
Васілеўскі, с. 35.

Шнуроўку апранаць — перамены к лепшаму, **знімаць з плеч яе** — к горшаму.
Васілеўскі, с. 35.

Шубу бачыць — шум будзеш чуць. Тое ж: хвароба.
Ляцкий. Материалы, с. 147.
Вар.: *Романов.* Опыт, с. 66.

Дайджест

В микросхемах — медь, а не алюминий


Компания "Ай-Би-Эм" разработала технологию изготовления микросхем с применением меди вместо алюминия, сообщает "Си-Эн-Эн". По мнению экспертов, внедрение нового метода позволит сделать компьютеры значительно дешевле и увеличить их производительность. Продажа новых микросхем начнется в начале следующего года. "Ай-Би-Эм" не планирует продавать лицензию на свое изобретение. Поскольку микросхемы используются во множестве электронных приборов, спрос на изобретение "Ай-Би-Эм" будет огромным. По данным "Си-Эн-Эн", микросхемы с использованием меди на 30 процентов дешевле традиционных. Сразу после сообщения "Ай-Би-Эм" о разработке курс ее акций на Нью-Йоркской бирже повысился на 5 процентов.

Миллион роз в Донецке, а в Китае их миллиарды...

Китайские ученые планируют использовать метод клонирования, чтобы сохранить редкие и ценные виды растений, сообщает агентство "Синьхуа". В список, составленный учеными Академии лесного хозяйства, вошли китайская роза, азалия и морозоустойчивые растения. По словам представителей Академии, китайское цветоводство отстает от европейского и американского на 20 лет, а клонирование поможет оживить эту традиционно сильную отрасль сельского хозяйства. Последние зарубежные исследования в области клонирования вызывают сильный интерес китайских ученых также потому, что они надеются применять эту технологию для повышения урожайности овощных культур и злаков.

Подготовила
Светлана РОСТОВА.

РЕЙТИНГ



В мире мудрых мыслей

Демократия — это не власть большинства, а защита меньшинства.

А.КАМЮ (1913—1960),
французский писатель, публицист, философ.

